УДК 811.161.3’271-115+811.161.3’28

В. А. Мандзік, навуковы супрацоўнік, канд. філалаг. навук
(Цэнтр даследаванняў культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, г. Мінск)

# СПЕЦЫФІКА КАНСАНАНТЫЗМУ ДЫЯЛЕКТНАГА МАЎЛЕННЯ Ў ПАРАЎНАННІ З ЛІТАРАТУРНЫМ

Сістэматызацыя і індэксацыя дыялектных архіўных матэрыялаў дае магчымасць нагляднага яго прадстаўлення ў адпаведнасці з акрэсленымі лінгвістычнымі задачамі. Аналіз зафіксаваных на беларускай тэрыторыі адказаў на пытанні паводле «Вопросника общеславянского лингвистического атласа» [1] дазваляе акрэсліць не толькі агульныя, заканамерныя, але і спарадычныя, спецыфічныя рысы кансанантызму дыялектнага маўлення, якія адрозніваюць яго ад сістэмы арфаэпічных норм літаратурнай мовы.

Даследуючы наяўны фанетычны матэрыял, мы звярталі ўвагу перш за ўсё на асаблівасці вымаўлення зычных гукаў. Такі выбар тлумачыцца некалькімі прычынамі. Па-першае, пакуль няма наяўных выпускаў фанетыка-граматычнай серыі Агульнаславянскага лінгвістычнага атласа, прысвечаных кансанантызму, камбінаторным змяненням зычных у моўнай плыні. Таму сістэматызаваныя намі з’явы будуць прадстаўлены ўпершыню. Па-другое, як слушна сцвярджаюць лінгвісты, менавіта зычныя гукі маюць вырашальнае значэнне для адрознівання і ўспрымання слоў [2, с. 322]. Па-трэцяе, сістэма кансанантызму беларускага маўлення колькасна больш багатая ў параўнанні з сістэмай вакалізму, таму дае больш шырокія магчымасці для прэзентацыі фанетычнай разнастайнасці дыялектнага маўлення. На падставе першаснага аналізу наяўнага матэрыялу намі ўстаноўлена, што ён рэпрэзентуе наступныя асаблівасці ў рэалізацыі зычных фанем (лічба перад словаформай азначае нумар населенага пункта, дзе гэты адказ зафіксаваны).

- Ужыванне мяккіх шыпячых і [р], якія ў літаратурнай мове заўжды цвёрдыя: 361 du’š’a, 362 du’š’a, 374 du’š’e (*душа*), 383 kr’i’vavj (*крывавы*), 373 č’as (*час*), 372 me’ž’a (*мяжа*), 335 ‘bur’a (*бура*).
- Узнікненне пратэтычнага (прыстаўнога) зычнага ў пазіцыі, не ўласцівай для літаратурнай мовы (у пачатку слова перад ненаціскным галосным): 343 hau̯’ca, 344 ha’v’ečka, 353 vau̯’ca, 374 ho’večka (літаратурнае – *аве́чка*).
- Ужыванне эпентычнага гука [j], які адсутнічае ў першапачатковай форме гэтага слова і ў літаратурнай мове. Ён узнік у выніку зацвярдзення губнога [в]: 360 vja’zau̯ (літаратурнае – *вязаў*).
- Узнікненне [j] (ятацыя) перад пачатковым ненаціскным [і], што не супадае з нормай літаратурнай мовы: 351 jiγ’raju (*іграю*), 347

jiγ’ruša (*ігруша*), 350 jisk’ra (*іскра*). І, у той жа час, адсутнасць [j] (ятацыі) перад пачатковым націскным [і]: 361 ‘iskra (*іскра*).

- Ужыванне пратэтычнага галоснага перад збегам зычных, першы з якіх – санорны: 328 ir’waṷ, (*рваў*), 349 ił’γaṷ (*лгаў*). І наадварот, адсутнасць устаўнога зычнага ў пазіцыі, якая ў літаратурнай мове прадугледжвае яго ўзнікненне: 369 pa’uk (*павук*).
- Замена гукаў: санорнага [в] на звонкі [б] (384 a’bečka – *авечка*), санорнага [в’] на санорны [л’] (330 ‘s’l’ečka – *свечка*), санорнага [л’] на санорны [н’] (363 zem’n’a – *зямля*).
- Знікненне пачатковага ненаціскнога галоснага ў словах, праславянская рэканструкцыя якіх гэты галосны ўтрымлівае: 375 ‘večka (*авечка*), 370 ‘hn’onək (*ягня*).
- Змякчэнне канцавога свісцячага ў пазіцыі, дзе ў літаратурнай мове ўжываецца цвёрды зычны: 361 ‘pałyc’, 373 ‘pałec’ (*палец*), 361 ‘zajic’ (*заяц*).
- Спарадычнае ўжыванне цвёрдых зычных на месцы мяккіх: 362 ja’s’on, 363 ‘jasen (*ясень*), 377 wola (*воля*). Мае месца і адваротная з’ява: ужыванне мяккіх зычных на месцы цвёрдых: 383 ‘jabl’iko (*яблык*), 352 ‘b’ur’a (*бура*).
- Адсутнасць аглушэння звонкіх на канцы слова, а таксама перад наступнымі глухімі: 363 γrab (*граб*), 370 babka (*бабка*).
- Знікненне пачатковага [j] у словах, якія пачынаюцца з ётавых галосных, або замена яго на [в]: 336 ah’n’uk, ahn’u’čok (*ягня*), 344–345 v’ar’mo (*ярмо*).
- Адсутнасць пераходу [д’] у [z’] перад ётавымі галоснымі (дзекання): 361 ny’d’il’a, 363 ne’d’ẹl’a (*нядзеля*).

Даследаваны матэрыял рэпрэзентуе дзве асноўныя групы адрозненняў ад літаратурнай мовы. Першая звязана з колькасным складам зычных фанем: у дыялектнай мове іх рэестр больш шырокі. Другая характарызуе якасць і частату ўжывання асобных гукаў і іх спалучэнняў, узаемаадносіны ў мікрасістэмах кансанантызму.

## ЛІТАРАТУРА

1. Вопросник общеславянского лингвистического атласа / гл.ред. А. И. Аванесов. – Москва: Наука, 1965. – 270 с.

2. Фанетыка беларускай літаратурнай мовы / І. Р. Бурлыка [і інш.]; рэд. А. І. Падлужны. – Мінск : Навука і тэхніка, 1989. – 335 с.

*Даследаванне выконваецца пры фінансавай падтрымцы БРФФД (дагавор № Г18М-086)*